А. СУМНЫ.

# МАЕ КОЛЯДЫ

Вільня —— 1920 г.
Коопэратыўнае Т—ства «ДРУК».

Выдавецтво У. Знамяроўскага.

*
* *

Быў каліськіка час
І ў мяне, як і ў вас,
Што я быў маладым,
Ды так ў меру—дурным...
Дык да школы хадзіў;
Між панамі і жыў
У вялікім у месьці;
Спосаб панскі і есьці
І адзетку узяў, —
Словам, панам я стаў...
Хаця пуста ў галове,
А у панскае мове
Я пачаў старавацi,
Забывацца аб хаці,
Аб звычаях вясковых,
Бо—прывык да мястовых...

---

Па такім уступленьні—
Раскажу вам здареньне!

---

Ужо восяню цэлу
Школа намі грымела,
І пачатак зімы
Правучыліся мы, —
Прышлі сьвяты, Каляды...
Я быў вельмі ім рады:

Будзя час аддыхнуць,
Кніжкі ў кут шпурлянуць.
Да таго — мой кампан
Казюк, — з прадзедаў пан,
Хлапец вельмі багаты, —
Запрасіў вось на сьвяты
І мяне у бацькаў двор...
Я на гэнае скор —
Зараз даў сваю згоду...
Як бач панскай падводай —
Пара коні, хвурман —
Еду я, ды кампан!

---

Было пекна у двары:
Гасьцей шмат ў вечары,
Йосьць што есьці ды піць,
А музыка грыміць,
Ад змуроку да раньня —
Шло ўсьцяж баляваньне!..
Я быў добра прыняты,
Бытцам нейкі багаты,
Хлапец роўны Казюку;
Падаваў ўсім руку:
Паном, паннам ды паням,
Ды займаўся скаканьням!..
Ды была жа ахвота:
Танцаваў я да потаў
Вальцы, полькі, кадрылі
Са сваею Марыляй,
Казюковай сястрою, —
Хто з кім, а я з ёю...
Бо ўжо вельмі ў спадобі
Была грыўку на лобі,
Вочкі мела анёла.
Ох, было мне вясёла!...

Ні агледзіўся я —
Як сталася бяда,
Ці вялікая ўцеха...
Цяпер сьмех... Ні да сьмеху
Там было мне тагды
Як сардэчнай жуды
Пачуў першыя сьціскі. .
Да каго? — да Марыські! .
Якто кажуць: па вушы
Усей хлапчынаю душай
Закахаўся ў дзяўчыні —
У яе вочках, грывіні,
У яе сьмеху звінячым..
Наат вачамі маячыў
Ды аб ёй мармытаў —
Так Казюк мне казаў!
Дык прызнаўся яму
(Толькі! — больш— нікаму!)
Што кахаю Марылю
Больш чым польку, кадрылю,
Больш чым нават яго,
Казюка сваяго!..
За адно яе слова
Усё зрабіць я гатовы:
Купіць стрэльбаў, нажоў,
Ды пайсьці на зьвяроў
Індыянскае дзічы —
Стацца там паляўнічым...
Сярод стэпу пажараў
Увіхацца з Эмарам...
Дык за ўсю нагароду
Хацеў-б мець яе згоду:
Што мяне ні забудзя,
Што скакаці ня будзя
Ужо ніколі з баронам
(Нейкім там нарачоным!)

Ды аддасьць мне з галовы
Сваю ўстужку ружову,
Як знак вечны ўспаміну...
Так кахаў я дзяўчыну!..

---

Усё чысьцінька гэта,
Пад вялікім сакрэтам,
Казюкові на вуха
Расказаў, а ён слухаў...
Ен спрыяў мне душою...
Абяцаўся з сястрою
Аба ўсім гаварыць—
Ды аб ўстужцы прасіць...
Бо я сам, далібог,
Старавацць з ей ня мог, —
Толькі ў вочкі глядзеў,
Ды як рак чырванеў!..

---

Цэлу ноч мы шапталі,
Розны пляны ўкладалі.
Урэшці стала на тым
(Мусім мецць на сваім!)
Калі ўстужкі ні дасьць,..
Та патрапімо ўкрасьць!

---

Ужо вокны сьвіталі,
Як мы змову канчалі;
Разоў колькі зяўнулі,
За тым скора паснулі!..

---

Я ў ва сьне ня прысьніў —
Чым дзянёк мне гразіў,
Што ужо наступаў...
Я спакойнінька спаў.
Раптам чую: паніч!
А-паніч! нехта кліча...

Ды за коўдру тармосіць,
Ды ўставаць мяне просіць...
Глянуў я—так з пад вока —
Аж та дворнавы лёкай
Нахінуўся ды кажа
(Прападзі сіла ўража!) —
Што ось з вёскі за мною,
Каб забраці з сабою,
„Хтось“ санямі прыехаў
(А сам скерыцца сьмехам). .
Абадай це напасьці!
Зразумеў я нішчасьце:
Будуць ведаць паны,
Каго маюць яны —
Што я ім ні раўня!
Што я—так—мужычня!
Што ўжо, пэўна, ніколі
Быць ня прыдзіцца болі
На Калядах—на сьвятах —
У такіх дворах багатых,
Між паноў, між вялікіх,
На іх скоках, музыках!..
Бо мне стыдна й самому,
Што я з простага дому!..
(Вось якога паняцьця
Быў калісь—хлапчаняцьцям).
Ды усё гэна нічога...
Мукі пекла самога
Я вялікі цярпеў —
Калі йшчэ зразумеў,
Што ніколі з Марыляй
Ні пайду у кадрылі,
У яе вочкі ні гляну,
Ды ўстужкі ні дастану!..
Пацямнела ў вачах,
Зашумела у вушах,

Я быў блізкі распачы, —
Чуць стрымаўся ад плачу...
Ды сказаўшы: «устану!»
Коўдрай вочы апрануў,
Бо, жадаючы схову,
Я закрыўся з галовай!..
Дык паганы лякай
Далей кліча: „ўставай!“
Ды за коўдру бярэцца...
Аж Казюк адазвецца
(Разбуджаны са сну):
„Дай спакой ты яму,
Ужо ўстанім мы самі —
Йдзі скажы гэна мамі!“

---

Лякай вышаў. Казюк
Дай рабіці стук-грук;
На маё ложка ўскочыў,
Развясёлы—хахоча,
Успамінае Марылю,
Што аб ёй гаварылі...
Я маўчлівы... Ледзь слова
Магу мовіць... «галова»
Кажу—„натта баліць“...
Што рабіць? Што рабіць?
Усьцяж пытаньне вінецца
Што рабіць? куды дзецца?
Ці адзеўшыся мо —
Уцячы праз вакно?!...
Кабы толькі з панамі
Ні сустрэцца вачамі...
Ды прад любай дзяўчынай
Мне дарэшты ня згінуць!..

---

Зноў лякай, дакладае,
Што з гарбатай чакаюць;

Дык далей адцягаці
Нельга было;—ўставаці
Трэ ужо нам канешна...
Мы ускочылі спешна,
Ды адзеты, памыты
Ідземо... моў прыбіты
За Казюкам цягнуся —
Так сарому баюся!..

---

А ў сталоўцы гасьцей —
Хмара ўсякіх людзей:
І старых, і малых,
І сваіх, і чужых...
Я ня помню нічога:
Ці казаў што да кога
Ці каму пакланіўся...
Помяю толькі: абліўся
Я гарбатай гарачай
Як Марылю убачыў,
Што з баронам сядзела,
Ды так дзіўна глядзела
На мяне, нібарака...
Сколькі спёк я там ракаў,
Каб хацёў ня злічыў-бы, —
Ды і вас умарыў-бы!..
Дык як ўсенька на сьвеці
Свой канец мае прэце —
Так і мука-гарбата
Мела ўрэшце канчатак:
Паны ўсталі і пані —
Ды с падзякай сьнеданьня
К Казюковай матулі
Грамадой пацягнулі...
Скарыстаў я з замехі,
Ды з вялікім пасьпехам—

Міжы іншых паноў —
Падышоў да бацькоў
Кампана: за гарбату,
За гасьціну, за сьвята —
Я падзяку злажыў
Але як? каб я жыў!
Сам я ні разумеў,
Што казаці хацеў! .
Дык і вышаў мармыт—
Адзін—проста-ну стыд!
Потым йшчэ камусь руку
Я падаў, ды з Казюкам
На уцекі пусьціўся
Ажно аж апыніўся —
У сваім я пакоі...
Казюк сёя ды тоя —
Усьцяж трэле-гавора,
Успамінае—што ўчора
Мы так лоўка на балі
У двох гулялі-скакалі;
Што ён вельмі шкадуя
Чаму з бацькам еду я
(Гэны „хтось" быў мой татка
З сваей простай апраткай!), —
Бо яму бяз мяне
Ужо та́к весяла не —
Час ня будзе мінацца!
Ах, каб мог я астацца!...
Мне яго ўспамінаньне,
Ды па мне бядаваньне —
Усенькі гэныя жалі
Косьцяй ў губе стаялі:
Каму ўцеха, забава,
А мне вышла ніслава!..
Хаця ён—маладой
З-панска добрай душой

Майго гора ня ведаў...
Яб-ж? хацеў толькі з едаў
Усіх гэных звярнуцца,
Найдалей апынуцца,
Каб злажыці манаткі,
Ды ўцячы бяз агляднкі!
Вось і кошык гатовы.
Шапку ўзьдзеў на галову
Ды пальточка на плечы
Я—гатоў да ўцечы!..
„Ну, дык будзь-жа здароў!“
І бяз лішніх там слоў
З Казюком абняліся,
Ды з сабой разсталіся!..

---

Я стаю ўжо на ганку,
Ды бацькаву хвурманку
Паглядаю скрось вокам
На дзядзінцы шырокім...
Шмат бо была канёў,
Ды з званкамі санёў,
Што паноў тых і паняў
Прывязьлі на сьнедаьня...
Ды ні бацькі, ні санак
Міжы панскіх хвурманак
Ні чуваць ані духу...
Аж ў тым шэпча над вухам
Дворны лёкай паганы, —
Што: вун там, ля паркану,
Да хлявоў дзе дарога,
Каля санак „з-убога“
Бацька з даўна чакая...
Пракляў ў душы лякая
За ягоны парады!...
Ды хоць вельмі нірады,

Мушу йсьці пяхагой
Праз хвурманак пастой
Прад палацу вакнамі!...
Чуць ні плачу с'лязамі
Над нядоляй сваей:
Пэўна шмат хто з гасьцей
Будзя ў вокны ўзірацца,
Нады мною сьміяцца—
І Барон, і Марыля,
І ўся панска хэўрыля!..
Этала мне гарачэ...
Хаць мароз аж пячэ
Вятрынёй студзяной,
Снег скрыпіць пад нагой,
Я ня йду, а ляту,—
Кабы скончыць бяду!

Вось ўжо сані ды татка...
І ні знаю: парадкам
Якім сталася гэна—
Толькі нейкая зьмена
У маёным паняцьці
Пачала наступаці..
Стала стыдна мне стыду,
Паказаўся я брыдай
Дзьля сябе наат самога...
Застыдаўся я—кога?
Свайго роднага таты!
Сваей роднае хаты!
Сваей роднай сярмягі!
Сваей роднай павагі!
Сваей роднае мовы—
Беларускай—вясковай!
Бяды свае з мусу!
Ды што я—з Беларусаў!...

Памаленьку, памалу
Праясьняцца мне стала
Усіх адносін загадка,
Палаженьня, парадкаў,
Што пануюць на сьвеці,—
Мыж сямьі аднэй дзеці!...
А жыцьцёвы варункі,
Ды ўселякі рахункі
Раздзялілі народ
На вярхі, ды на спод, —
На багатых паноў,
На бяду—беднякоў...
Адны ў пекных адзеты,
І зімою і летам,—
Добра маюцца ўсёгды...
Так праходзяць іх годы:
Быць ў нейкім у сьне,
Быць у вечнай вясьне!..
А другія—ў бядзе,
Што ў вакол іх гудзе,
Ды к нішчасьцю вядзе
Па жыцьцёвай грудзе
Валакуць свае лямкі...
Ні чапаюць наат клямкі
Тых да шчасьціўка дзьвераў,
Ды жывуць жыцьцём зьвераў
Жыцьцём гора—нядолі
Ды ўселякай няволі!..
Стала ясна мне ясна:
Што да гэных нішчасных,
Усё жыцьцё прапавітых,
Усім і ўсімі прыбітых,—
Я павінян схінацца,
Ды ім сэрцам аддацца!
Усягды быць з імі
З бедакамі сваімі:

З іх я целам-крывёю —
З імі быць трэ душою!..
Трэба мне літавацца
(А ня то што стыдацца!)
Напрагчы свае сілы
Для карысьці для мілых
Братоў шэрых вясковых..
Вучыць поступкам словам,—
Як змагацца з нядоляй,
Каб багатшымі боляй
Былі ў розум і сэрца,
Ня былі ў паняверца!
Каб іх хата бальшэла,
Цяпла, сьвету больш мела!
Кабы бедныя нівы
Былі больш урадлівы!
Ды каб быў больш здаровы
Увесь народ мой вясковы!..

---

Думкі гэны—другія,
Хаця сілай цяжкія,
Скрой-маланкай блеснулі
І—душу закранулі!..
Гэны міг быў мне векам
І—я стаў—чалавекам!
Другім-іншым—і новым —
З другім чуцьцём, галовой!..
Усю жыцьця шумавіну,
Розум прыткі мой скінуў!..
Ды убачылі вочы,
Што было ў змурочы
Пад плашчом дзяцінады..
І быў вельмі я рады
Праўдзі болю сьвятога!
Ужо ня стыдна нікога:

Ні барона й Марылі,
Ні жыцьця камарылі!...
Падбег борзда к Татулю,
Ды як добры сынуляк,
Уцалаваў яго рукі—
Быццам з доўгай разлукі!..
З ім гаворку пачаў;
Памагаці тож стаў
(Ні стыдаўся нізваньня!)
Папраўляць упраж, сані..·

---

З мінай пэўнай мы селі,
Ды на „двор“ паглядзелі...
І адважна і сьмела
(Ніякога мые дзела
Ні было—ці ўзіраўся,
Ці хто плакаў, сміяўся...
Я сядзеў с татам мілым
І пачуў ў сабе сілы...
Быў на ўсенька гатовы!)
Дык з двара па жыцьцёвы
Я паехаў дарогі —
Кінуў панскі парогі!..

---

Вось якоя здарэньне
Апісаць замярэньнем
Было—з дзяцінады!..
Ці патрапіў? даў рады?
Гэта меньшая рэч:
Скінуў працу я с плеч!

Вёска Капанікі.
13 студня 1905 г.